**Тухта, В.** Браты-«афганцы» / В. Тухта // Лепельскі край. — 2014. — 8 крас. — С. 6.

# БРАТЫ-«АФГАНЦЫ»




**Многія лепяльчане цягам дзесяці гадоў «афганскай» вайны праходзілі службу ў праслаўленай яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай 103-й Віцебскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Разам з іншымі дэсантнікамі асвойваў навуку вайны ў горных умовах і ўраджэнец вёскі Вілы Васіль Пшонка.**

25 снежня 1979 года 357-ы полк, у якім ужо трэці год служыў хлопец на пасадзе фельчара, паднялі па трывозе. На самалётах з некалькімі перасадкамі перакінулі ў Афганістан. Горад Кабул сустрэў відебскіх дэсантнікаў нязвыклай для еўрапейскіх шырот спёкай. З нуля, не маючы адпаведнага вопыту, у папявых умовах прыходзілася наладжваць медыцынскае забеспячэнне палка. Прапаршчыка Пшонку прызначылі начальнікам аптэкі. Хворых, якія сталі паступаць у санчасць з першых дзён знаходжання ў Афганістане, можна ўмоўна аднесці да баявых страт. Ворагам ваенных сталі інфекцыйныя захворванні, прычынай якіх былі антысанітарныя ўмовы, адсутнасць чыстай пітной вады.

Прафесія медыка, якая і ў мірны час даволі запатрабаваная, на вайне набывае яшчэ большую вагу. У тых выпадках, калі побач з табой ліецца кроў таварышаў, а ты не ведаеш, як ім дапамагчы, медыкі былі адзінай, хоць і маленькай, надзеяй на выратаванне.

Неаднаразова за два гады, праведзеныя ў Афганістане, Васіль выходзіў на «баявыя» разам з падраздзяленнямі палка. Колькі было тых выхадаў, ужо і не памятае. Неаднаразова ўступалі ў сутычкі з «душманамі», якія, застаючыся нябачнымі ў складках гарыстай мясцовасці, праследавалі савецкія ваенныя калоны на ўсім шляху іх руху. У зручны момант рабілі напады. Першае, за што адразу хапаўся Васіль, была не сумка з медыкаментамі, а аўтамат. Потым, ужо ў ходзе бою, здзяйсняючы рознага кшталту фінты і манеўры, каб, не дай бог, самога не зачапіла кулямі, даводзілася дабірацца да параненых, аказваць першую дапамогу.

У Саюз, на Радзіму, бацькам і жонцы Наталлі ляцелі лісты са сціплым, стандартным наборам слоў, маўляў, усё нармальна, служба працякае спакойна. Але чамусьці кожны раз маці Ірына Якаўлеўна, атрымліваючы чарговае пасланне ад Васілька, так яшчэ ў дзяцінстве называла свайго першынца, употайкі ад малодшых дзяцей пускала слязу. Адчувала мацярынскае сэрца трывогу і боль за сына.

Васілю пашанцавала, выжыў на той вайне, нават ніводнага разу не быў паранены. Пасля Афганістана былі служба ў танкавым палку ў Баравусе, восем гадоў, праведзеных у мангольскіх

стэпах. Затым вярнуўся на радзіму. Апошняе месца службы прапаршчыка Пшонкі – Полацкі ваенны шпіталь, адкуль і быў звольнены ў запас.

* * *

Бацькі Даніла і Ірына Пшонкі нават і не здагадваліся, што ў хуткім часе і малодшы сын Віктар таксама апынецца ў Афганістане. Па іроніі лёсу ён трапіў служыць у той полк, дзе калісьці праходзіў службу старэйшы брат. У кастрычніку 1985 года хлопца з другога курса Лепельскага тэхнікума забралі ў войска. Разам з Віктарам прызываўся і яго лепшы сябра Генадзь Закрэўскі, з якім сядзелі ў школе за адной партай, заставаліся неразлучнымі і ў тэхнікуме. У Віцебскім аблваенкамаце пры адборы навабранцаў пераважнае права мелі дэсантнікі. Маючы добрую фізічную падрыхтоўку, Віктар без цяжкасцяў прайшоў папярэдні адбор. Генку «купцы» забралі ў пагранічныя войскі.

* * *

Паўгода ў вучэбным падраздзяленні Ферганы для Віктара праляцелі незаўважна. З першых дзён знаходжання ў часці для навабранцаў не было сакрэтам, што іх рыхтуюць у Афганістан. Тады яшчэ яснага ўсведамлення таго, што трапяць на вайну, не быто. Таму не было і страху. Наадварот, маладым васямнаццаці – дзевятнаццацігадовым хлопцам хацелася паказаць сябе героямі.

Служыў у Кабуле, падраздзяленне несла ў асноўным вартавую службу. За рэдкім выключэннем здараліся няштатныя сітуацыі, але загінутых сярод саслужыўцаў не было, толькі параненыя і кантужаныя.

Па часе службы Віктару шчасціла на сустрэчы з землякамі. На адным з канцэртаў напаткаў Алега Голуба з Забаення, які служыў у 180-м мотастралковым палку. Перад войскам хлопцы бачыліся на вясковых дыскатэках у Слабадзе. Некалькі разоў сустракаліся з Сяргеем Спірыдовічам, з якім вучыліся ў тэхнікуме ў адной групе. Праўда, таго забралі ў войска на паўгода раней. Праз пэўны час у палку аб’явілі, што Сяргей Спірыдовіч загінуў.

Найбольш яскравыя ўспаміны засталіся аб сустрэчах са стрыечным братам Васілём Вашкевічам, таксама ўраджэнцам Вілаў. Васіль служыў у 103-й дывізіі, толькі ў іншым палку. Неаднаразова хлопцы бавілі вольны час разам, успаміналі гады дзяцінства і юнацтва, праведзеныя ў наваколлях роднай вёскі. Віктар вучыў брата, які быў на прызыў маладзейшы, асаблівасцям службы ў горнай краіне.

Дзесьці зусім побач, на мяжы з Афганістанам, нёс службу Генадзь Закрэўскі. У складзе мотаманеўровай групы яму неаднаразова даводзілася бываць «за рэчкай». Пагранічнікі таксама ўдзельнічалі ў баявых дзеяннях у Афганістане.

Апошнія паўгода службы Віктара Пшонкі прайшлі на адной з горных застаў, якія былі раскіданыя на ўсім працягу дарогі, што вяла на Чырыкар. Сярод гор, якія ўвесь час хавалі небяспеку, пад пякельнымі промнямі афганскага сонца ў лістападзе 1987 года прыйшоў «дэмбель». Дома дзяліліся ўспамінамі з Закрэўскім, які таксама ў гэты час вярнуўся са службы. Нямала цікавага сам даведаўся ад сябра. Разам станавіліся на ўлік у райваенкамаце. Ім, маладым хлопцам, няёмка рабілася ад таго, што ў свае дваццаць год, як і дзяды, што прайшлі дарогамі Вялікай Айчыннай вайны, мелі ў ваенным білеце адзнаку ўдзельнікаў баявых дзеянняў.

**Валерый Тухта**

**На здымках:** Васіль Пшонка, Віктар Пшонка